Менталітэт беларусаў у люстэрку метафар

В.Ю. Шыманская
shimans@tut.by
(Мінск, Беларусь)

Сучасныя даследаванні метафары як механізма пазнання і мыслення вядуцца ў сістэме каардынат моўнай мадэлі свету, якая заключаецца ў тым, што кожная мова адлюстроўвае пэўны спосаб успрымання і арганізацыі (канцэптуалізацыі) свету. Выражаныя ў ёй значэнні складаюцца ў адзіную сістэму поглядаў, свайго роду калектыўную філасофію, якая з'яўляецца абавязковай для ўсіх носьбітаў мовы [1, с. 38 – 39]. Такая мадэль часта супярэчыць лагічнай, навуковай карціне свету, прычым асацыяцыі і карэляцыі такога плану адлюстроўваюць вопыт інтраспекцыі дзесяткаў пакаленняў на працягу многіх тысячагоддзяў і могуць служыць надзейным праваднікам ва ўнутраны свет чалавека [там жа].

Сувязь тыпалагізацыі кампанентаў моўнай мадэлі свету і ўзнікнення метафарычных найменняў абумоўлена імкненнем чалавечага розуму тлумачыць складаныя, недаступныя непасрэднаму ўспрыманню з'явы і паняцці больш простымі, канкрэтнымі, прадметнымі, адчувальнымі. Прыярытэт асабістага вопыту чалавека ў пазнанні, а таксама тлумачэнне невядомага ўжо вядомым з'яўляецца асноўным законам метафарызацыі.

Метафары, якія адлюстроўваюць унутраны свет беларуса, маюць дачыненне да наймення ды характарызацыі пачуццяў, думак, разнастайных аспектаў камунікацыі. Такім метафарам уласцівыя антрапацэнтрычнасць, сінкрэтычнасць, анталагічнасць і шырокая прадстаўленасць у мове. У той час як метафары ўтвараюць свайго роду адлюстраванне каштоўнасцяў і маральных нормаў этнасу ў мове, асновай для іх узнікнення служаць, як правіла, з'явы прыроды, прадметнай рэчаіснасці (у тым ліку паўсядзённага побыту), найменні разнастайных адцягненых паняццяў і культурных з'яў.

У беларускай мове цела чалавека яшчэ са старажытнасці ўспрымаецца як храм духа; душа чалавека, яго памяць выступаюць у якасці ўмяшчальнікаў пачуццяў і думак, таму прадуктыўным

з’яўляецца перанос «будынак і яго часткі → душа, памяць і свядомасць»: *патаемныя сховы душы, тайнік сэрца, лабірынты памяці, памяць – цудоўная сховань*. Відавочна, што семантычная структура крыніцы матывацыі праектуецца на абазначаемае, высвечваючы семы ‘прыхаванасць’, ‘тайнасць’, у выніку чаго душа адлюстроўваецца як нешта патаемнае, а памяць – як сховішча інфармацыі. Экстэрыярызацыя пачуццяў, думак, свабода думкі і дзеяння метафарычна адлюстроўваецца як выхад на паверхню, адкрыццё зачыненага (праекцыя «адтуліна ў будынку → выяўленне асобы»): *адчыніць аконне душы, даць выхад пачуццям, не знаходзіць аддушыны*.

Найменні збудаванняў і частак будынкаў, што выкарыстоўваюцца для адмежавання чаго-небудзь, метафарычна пераасэнсоўваюцца як абазначэнні адасобленасці, адзіноты, ахоўных механізмаў псіхалогіі асобы (праекцыя «перагародка → адасобленасць, адзінота, непаразуменне»), а таксама апісання непаразуменняў, канфліктаў: *пакутлівая сцяна маўчання, бар’ер маўклівасці, душа раскрыецца, калі між намі не будзе ніякіх перагародак*.

Недаступнасць перажыванняў і думак назіранню і імкненне чалавека даведацца, што адбываецца ў душы іншага, дае імпульс да ўяўлення працэсу доступу да ўнутранага свету чалавека як дарогі, шляху, сцежкі: *сцежка да сэрца, шукаць шлях да сэрца, знайсці дарогу да сэрца*. Беларускія полісеманты даволі часта актуалізуюцца ў падобных кантэкстах са станоўчай канатацыяй, што сведчыць пра тое, што для беларускай характэрна імкненне да збліжэння, усталявання эмацыянальнага кантакту з субяседнікам.

Словы, што называюць разнастайныя захворванні, іх праяўленні, а таксама з’явы і дзеянні, што ўключаюцца ў тэзаўрус хваробы, можна класіфікаваць на некалькі груп. Гэта найменні хвароб, сімптомаў хвароб, ран, парушэння функцыянавання органаў і сістэм, псіхічных адхіленняў. Полісеманты, якія абазначаюць хваробу наогул, звычайна называюць адмоўныя з’явы псіхалогіі чалавека, даюць ім негатыўную ацэнку: *хвароба душ, паталогія паводзін*. Карані такіх метафар ва ўспрыманні захворванняў як парушэння суцэльнасці чалавека, яго спрадвечнага ідэальнага вобразу як нашчадка Бога. Яшчэ адным тлумачэннем дадзенай

мадэлі з'яўляецца схільнасць беларусаў да выразна негатыўнай ацэнкі неадпаведных норме паводзінаў.

Метафарычная мадэль «Прадмет», як правіла, канцэнтруе ўвагу на функцыянальным боку псіхалогіі чалавека, на прычынна-выніковых суадносінах. Сярод тыпаў і падтыпаў метафарычных пераносаў «прадметнай» сферы вылучаюцца: «яд → тое, што шкодна ўплывае на душэўны стан», «лекі → тое, што суцяшае, прыносіць заспакаенне», «адзенне, тканіна → падманлівая знешнасць», «прадметы вупражы, насілля і паляўнічыя рэаліі → тое, што абмяжоўвае свабоду», «бруд → амаральнасць, глупства, непатрэбнае», «след → адметная рыса характару, вынік псіхалагічнага ўздзеяння» і інш.

Цікава, што ў той час як метафары дадзенай групы звычайна не ўтвараюць прадуктыўных мадэляў з вялікай колькасцю праекцый, на іх аснове можна скласці цэлую энцыклапедыю побыту і заняткаў беларусаў – земляробства, жывёлагадоўля, паляўніцтва, ткацтва і інш.: *жарты – атрута старому сэрцу, спагада была самым неабходным і пажаданым лякарствам, словы былі лекамі, ланцуг пакуты, ярмо тугі, каханне – лёгкая прынада для сэрцаў, трапіць у сіло кахання*.

Такім чынам, як сведчыць аналіз і сістэматызацыя метафар унутранага свету чалавека, сфера крыніцы матывацыі адлюстроўвае асяроддзе існавання беларускага этнасу – ад прыроды і побыту да абраднасці і сацыяльнай сферы. У той жа час у люстэрку метафар мы бачым вобраз беларуса, для якога характэрна атаясамліванне перажывання з «унутраным чалавекам», станоўчая ацэнка эмацыянальнага збліжэння з субяседнікам, імкненне да негатыўнай ацэнкі не адпаведных норме паводзінаў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Апресян, Ю.Д. Образ человека по данным языка: попытка системного описания / Ю.Д. Апресян // Вопросы языкознания. – 1995. – № 1. – С. 37 – 67.

2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / АН БССР, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа; пад аг. рэд. К.К. Атраховіча. – Мн. : БелСЭ, 1977 – 1984. – 5 т.